Сваімі рукамі

СТРОІ, ЯК У ПРОДКАЎ,

або Пад брэндам традыцый

Часам глядзіш на беларускі нацыянальны строй і нават крыху зайздросціш: якія ж былі ў нашых продкаў прыгожыя сукенкі ды кашулі! Вось бы мець нешта падобнае зараз... Чаму ж не? Ірына ПАЎЛОВІЧ, студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, ужо некалькі гадоў займаецца вырабам народных строяў у шэрагу тэхнік: ткацтва, вышыўкі, вязання, пляцення і іншых.

— Мне заўжды было цікава ствараць нешта прыгожае і карыснае, спалучаць, канструяваць, увасабляць, нават калі вынік значна адрозніваўся ад пачатковай задумы, — расказвае дзяўчына. — Некалі я моцна захапілася жывапісам, але ўвесь час заставалася крыху незадаволеная тым, што выявы нельга выкарыстаць напоўніцу. Хацелася ствараць менавіта рэчы. Я доўга не наважвалася падысці да матэрыялу: ведаў і навыкаў, атрыманых на «працоўным навучанні» ў школе, не ставала.

«Саджуся «на гадзінку» пашыць і, канешне ж, раблю гэта даўжэй, да поўнага задавальнення ад зробленага, ахвяруючы іншымі не менш важнымі справамі».

Шмат чаго ў маім жыцці змянілася, калі я даведалася пра Студэнцкае этнаграфічнае таварыства. Пачала наведваць гурток «Шыем строй». Хацела стварыць для сябе адзенне на матыў з традыцыйнага Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці, адкуль паходзіла мая прабабуля па матчынай лініі. Менавіта ў гуртку я навучылася разнастайным прыёмам, своеасаблівай логіцы традыцыйных рэчаў. Больш за тое, пазнаёмілася з сапраўднымі майстрамі і майстрыхамі, якім бязмерна ўдзячная за натхненне і навучанне і да якіх часам звяртаюся па параду. Мой строй быў гатовы ўжо праз паўгода, але, як аказалася, самае цікавае чакала мяне наперадзе.

— Можа, і адмысловыя прылады якія маеш?

— На лецішчы ёсць кросны, якія ўяўляюць сабой звычайны, былы ва ўжытку варштат пасляваеннай работы. Падчас экспедыцыі Студэнцкага этнаграфічнага таварыства «Пружаны — Кобрын 2016» мясцовыя жыхары згадзіліся аддаць яго за вельмі сімвалічны кошт. Да гэтага за кроснамі я сядзела літаральна некалькі разоў, але ўжо паспела пранікнуцца прадуманасцю і прыгажосцю ручнога ткацтва. Сваякі падтрымалі маё памкненне і згадзіліся дапамагчы ў іх транспарціроўцы, за што я ім вельмі ўдзячная. Насамрэч, кросны сталі для мяне адным з самых каштоўных набыткаў.

— Табе ў рабоце хтосьці дапамагае?

— Непасрэдна рэчы я вырабляю сама, але ёсць справы, якія самастойна не зробіш. Напрыклад, для якаснай запраўкі кроснаў — падрыхтоўкі іх да ткання — патрэбны два-тры чалавекі. Мне дапамагае маці, і гэтая справа займае ў нас звычайна некалькі дзён.

— Дзе чэрпаеш натхненне?

— Заўжды ёсць ідэі, якія чакаюць увасаблення, але, натуральна, з'яўляюцца яны на падставе чагосьці ўбачанага. Досыць вольна адчуваю сябе ў стварэнні «на матыў», іншымі словамі, часта раблю тое, што ўяўляецца менавіта мне, ніколі не імкнуся да дакладнай рэканструкцыі. Вялікім натхненнем для мяне застаюцца аўтэнтычныя вырабы і расповеды носьбітаў традыцыі. Калі падарожнічаю, як па Беларусі, так і па замежжы, заўжды наведваю этнаграфічныя музеі. Але ні адзін музей не заменіць гутарку з майстрамі сталага веку...

— Што для цябе самае складанае?

— Размяркоўваць час. Здараецца, што саджуся «на гадзінку» пашыць і, канешне ж, раблю гэта даўжэй, да поўнага задавальнення ад зробленага, ахвяруючы іншымі не менш важнымі справамі.

— Чаму, на тваю думку, так важна аднаўляць даўнія традыцыі?

— Па-першае, традыцыйныя рамёствы кіруюцца неверагоднай лагічнасцю і разумным выкарыстаннем матэрыялаў. Падругое, шматлікія прыёмы і тэхнікі ўдала інтэгруюцца ў сучаснасць, пэўным чынам выпрацоўваюць непаўторны і пазнавальны стыль. Традыцыя — куды шырэйшая за арнаментаваную стужку, хочацца даносіць гэта праз рэчы, якія я раблю.

«Вялікім натхненнем для мяне застаюцца аўтэнтычныя вырабы і расповеды носьбітаў традыцыі».

— У якой тэхніцы больш за ўсё любіш працаваць?

— Па-шчырасці, займаюся толькі тым, што вельмі падабаецца. Падкрайное адзенне мае шмат цікавых вырашэнняў з пункту гледжання канструкцыі, раскройкі, стварэння сілуэтаў і выкарыстання дробных дэталяў. Вязаць пульсэткі, усыпаныя шклянымі перлінамі, проста вельмі прыемна. Акуратна і раўнамерна ставіць каляровыя штампы рознай формы, прыдумляючы спалучэнні і кампазіцыі, — неверагодна захапляльна. Пра ткацтва магу казаць бясконца, бо гэта праца, якая патрабуе высілкаў, часу, цярпення, прадумвання і некаторага «праграмавання» вынікаў, а адчуванне наяўнасці сваёй тканіны — непередавальнае.

Апошнім часам заказы паступаюць усё часцей, чаму я вельмі рада: гэта магчымасць спрабаваць нешта новае.

— Плануеш развіваць свой асабісты брэнд?

— Натуральна, думаю працягваць працу, якая прыносіць шмат радасці, тым болей ёсць куды імкнуцца і чаму вучыцца. Паўнавартаснага камерцыйнага праекта пакуль не прыдумляла, але ўсё можа быць. Канешне, мару мець болей часу. Асабліва дзеля таго, каб паспець пазнаёміцца са сталымі майстрыхамі і майстрамі, пераняць традыцыю ад жывых носьбітаў і ўвасобіць яе ў сваёй творчасці — гэта, на маю думку, будзе самы каштоўны ўнёсак.

Ганна ЯЎСЕЙЧЫК,
студэнтка III курса
факультэта журналістыкі БДУ.

Ідэі маладых

ПРА НАВУКУ ПА-БЕЛАРУСКУ? БЫЛО Б ЖАДАННЕ!

Аб'явамі аб адукацыйных імпрэзах зараз кагосьці здзівіць складана. Толькі каб наведаць навуковую лекцыю, на якой інфармацыя выкладалася б проста і, галоўнае, зразумела для чалавека любога ўзросту, трэба, каб моцна пашанцавала. А ці лёгка засвойваць навуку на беларускай мове? Спроба Анастасіі ПАЛТАРЖЫЦКАЙ ператварыць складанае ў даступнае і цікавае, а затым выкласці гэта па-беларуску вылілася ў праект «Навука на балоце».

Два гады таму, яшчэ будучы студэнткай БДУ, дзяўчына разам з сябрам вырашыла знаёміць людзей з фізікай. Дамовіліся: дзяліцца інфармацыяй будуць у выглядзе лекцый. Пасля перамоў з адной інтэрнэт-кампаніяй, якая дазволіла правесці мерапрыемствы на іх пляцоўцы, дзяўчына пачала рыхтаваць тэарэтычны матэрыял. Цудоўна памятае: тэма датычылася малекулярнай фізікі. На другую сустрэчу быў запрошаны работнік музея, які паказваў доследы з вадкім азотам. Пачатак праекта прыйшоўся на вясну, у той час сябры правялі толькі некалькі лекцый.

— А потым распачаўся новы сезон. Сярод тэм у нас была электрычнасць, астраномія. Расказвалі нават пра генетыку. Прывозілі прыборы з лабараторыі, глядзелі на Месяц праз тэлескоп з вуліцы. Сапраўды, шмат усяго было..., — успамінае Анастасія. — Асабліва спадабаліся лекцыі па генетыцы, разлічаныя на больш дарослую аўдыторыю, ды і лектар добра падрыхтаваўся.

Дзяўчына расказвае, што знайсці лектара — задача няпростая, бо трэба, каб у чалавека было не толькі жаданне расказаць, але яшчэ і здольнасць данесці інфармацыю папулярна на беларускай мове. Схема «падслухаў — расказаў» працуе тут на ўсе сто: часам толькі праз знаёмых можна знайсці тых, хто пагодзіцца бясплатна патраціць свой час. Аднойчы запланаваная лекцыя па філасофіі адмянілася, таму што запрошаны лектар прызнаўся: «Я не змагу расказаць даступна!» Здараюцца і цяжкасці з перакладам. «Але калі патрабуецца дапамога, я заўсёды гэта раблю», — дадае Анастасія.

Па словах арганізатара, на простыя тэмы яна запрашае сяброў са старэйшых курсаў. На сустрэчах навучаюцца ўсе: для лектараў таксама карысная работа з аўдыторыяй.

Сама імпрэза складаецца з некалькіх частак: прэзентацыя тэмы, гульні з аўдыторыяй, а другая частка — практычная.

— Верагодна, было б прасцей рыхтаваць матэрыялы па-руску. Чаму вырашылі выкарыстоўваць беларускую мову?

— Я была яшчэ малая, калі мяне прывялі ў суполку, дзе захапляліся беларускамоўнымі настольнымі гульнямі. Там і пазнаёмілася са сваім сябрам. Ён прапанаваў зрабіць нешта на мове. Я падумала пра лекцыі. Вось так і з'явілася «Навука на балоце». Праўда, цяпер працую адна, бо ў сябра з'явіўся ўласны праект.

Дарэчы, лекцыі цалкам некамерцыйныя, бо знайсці спонсараў не так проста. Затое актыўнасць абавязкова заахвочваецца яблыкамі. Анастасія кажа, што калі іх не застаецца, гэта значыць адно — сустрэча сапраўды атрымалася.

— Мне падабаецца, што лекцыі наведваюць і дзеці з бацькамі, і студэнты, і людзі больш сталага ўзросту. Слухаюць, падказваюць, спрабуюць размаўляць на беларускай мове, — кажа дзяўчына.

Звычайна атмасфера на пляцоўцы заўсёды цёплая, і на тое ёсць пэўныя прычыны: сюды прыходзяць людзі, якія чакаюць кожную лекцыю, таму Анастасія ўжо ведае многіх у твар. Кажа, што можа прыйсці 60 чалавек, а часам — усяго 10. Тлумачыць: «Усё залежыць ад тэмы».

Папулярызацыя навукі і беларускай мовы — менавіта так арганізатар вызначае мэту лекцый. На яе думку, мова павінна выкарыстоўвацца ва ўсіх сферах жыцця, таму дзяўчына імкнецца максімальна спрыяць гэтаму працэсу. Але займацца ўсім адной не так проста...

— Я хачу, каб праект дзейнічаў, таму што ён сапраўды файны, — тлумачыць Анастасія. — Калі да цябе прыходзіць выкладчык і пасля лекцыі кажа, што ўсё было крута, гэта ўзрушвае. Прыязджаў і мой сябра, што навучаецца ў Германіі ў аспірантуры. Ён падышоў пасля лекцыі і сказаў: «Насця, ты клёвая». Ведаеце, калі чуеш такую ацэнку сваёй працы, то хочацца рабіць. Яно тады і само робіцца.

Таццяна АШУРКЕВІЧ,
студэнтка II курса
факультэта журналістыкі
БДУ.